# На радзіме Яна Скрыгана

***16 лістапада адзначаецца 117-годдзе з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Яна Скрыгана (1905 – 1992). З гэтай нагоды 16 кастрычніка ўдзельнікі праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» наведалі яго родныя мясціны – аграгарадок Камень Капыльскага раёна, дзе ў гісторыка-краязнаўчым музеі мясцовай школы размешчана экспазіцыя, прысвечаная творцу.***



*Дома ў Галіны Скрыган. 6 верасня 2022 г. Фота Т. Лаўрык*

Ёсць адкрытыя і спагадлівыя людзі, з якімі хочацца кантактаваць, сустракацца і актыўна падтрымліваць сувязь. Гэтаму спрыяе і жаданне больш даведацца пра часы, сведкамі якіх яны былі. Для мяне такімі людзьмі сталі Галіна Іванаўна Скрыган, дачка Яна Скрыгана, і Яфім Самуілавіч Плаўнік, сын класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулі.

З Галінай Скрыган я пазнаёмілася ўлетку 2020 года. Якраз у гэты час мы працавалі над раздзелам, прысвечаным 115-годдзю з дня нараджэння Яна Скрыгана, у межах віртуальнага праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «На хвалі часу, у плыні жыцця». Згаданы праект ушаноўвае памяць творцаў, якія пачыналі свой шлях з першага літаратурнага аб'яднання Беларусі «Маладняк» (1923 – 1928), куды ўваходзіў і Янка Скрыган. Пры працы над раздзелам узнікла праблема размяшчэння ў адкрытым доступе ў межах праекта поўных тэкстаў прыжыццёвых кніг Яна Скрыгана, якія можна было б спампоўваць карыстальнікам, заходзячы на партал бібліятэкі. Згодна з аўтарскімі правамі, на працягу 50-і гадоў пасля смерці пісьменніка нельга размяшчаць поўныя тэксты яго кніг у вольным доступе без дазволу яго нашчадкаў, таму гэтую праблему мы не маглі вырашыць без Галіны Іванаўны – спадчынніцы Яна Скрыгана. Знайсці кантакты дачкі пісьменніка нам дапамаглі супрацоўнікі гісторыка-краязнаўчага музея «Бацькаўшчына», створанага на базе Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад – сярэдняя школа аграгарадка Камень. З 2010 года яны актыўна працавалі над экспазіцыяй, прысвечанай Яну Скрыгану. Так і пачалося сяброўства з Галінай Скрыган, якая прыязна паставілася да нашай ініцыятывы і дапамагла вырашыць пытанне з размяшчэннем поўных тэкстаў кніг пісьменніка.

Кожныя пяць гадоў да юбілею свайго бацькі Галіна Іванаўна рыхтуе друкаванае выданне. Ужо выйшлі кнігі «Ян Скрыган ва ўспамінах» (2010), «Сэрцу горкая далячынь» (2013), «Добра, што я іх ведаў» (2014) і іншыя, укладальніцай якіх з'яўляецца дачка пісьменніка. 12 лістапада 2020 года яна прыняла ўдзел у літаратурнай вечарыне «Кругі лёсу Яна Скрыгана», што прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі да 115-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, на якой прэзентавала новую кнігу – «Фоталетапіс з хатняга архіва Яна Скрыгана» (2020).

Я не перастаю здзіўляцца актыўнасці і працавітасці гэтай жанчыны, якая сваё жыццё прысвяціла ўшанаванню памяці бацькі. Менавіта дзякуючы такім людзям захоўваецца гісторыя роду. Па прапанове Галіны Іванаўны і была створана экспазіцыя, прысвечаная Яну Скрыгану ў рамках гісторыка-краязнаўчага музея школы аграгарадка Камень (пісьменнік нарадзіўся недалёка ад яго – у вёсцы Труханавічы, але на сёння там няма школы).



*Экспанаты музея. 16 кастрычніка 2022 г. Фота Т. Лаўрык*




*Самаробная кніга Я. Скрыгана. 16 кастрычніка 2022 г. Фота Т. Лаўрык*

Знаёмства з Галінай Іванаўнай адкрыла для мяне пісьменніка Яна Скрыгана. На кватэры ў яе – асобныя куточкі з фотаздымкамі бацькі, яго асабістымі рэчамі і вырабамі, створанымі яго рукамі. Напрыклад, кіёчкі Яна Скрыгана, якія ён выразаў сам, аздабляючы спецыяльнымі скуранымі завязкамі. З кіёчкамі пісьменнік хадзіў для саліднасці, бо для хады яны яму і не былі патрэбны. Такія ж кіёчкі пабачылі мы на экспазіцыі Яна Скрыгана ў аграгарадку Камень. Галіна Іванаўна перадала для музея шмат асабістых рэчаў бацькі.

У мінулым годзе гісторыка-краязнаўчы музей «Бацькаўшчына» адзначыў сваё 10-годдзе. Дзякуючы намаганням Галіны Скрыган, дырэктара школы Галіны Мікалаеўны Васілевіч, кіраўніка музея Ірыны Іосіфаўны Тагіль, ён папаўняецца новымі экспанатамі. Не кожны літаратурны музей і ў сталіцы можа пахваліцца такой калекцыю арыгінальных рэчаў пісьменнікаў, як у гэтым музеі, дзе на экспазіцыі Яна Скрыгана прадстаўлены дакументы, граматы і ўзнагароды, пісьмовы стол, прадметы гардэроба, гадзіннік, асадкі, друкарка і многае іншае. Разам з дачкой пісьменніка Галіна Васілевіч і Ірына Тагіль удзельнічалі ў верасні 2021 года ў XXVIII Дні беларускага пісьменства ў Капылі, 3 лютага 2022 года выступілі ў Нацыянальнай бібліятэцы на навукова-практычным семінары «Ураджэнцы роднага краю», на якім распавялі пра дзейнасць музея і навукова-даследчую працу школьнікаў па вывучэнні творчасці пісьменніка.

16 кастрычніка 2022 года ўдзельнікі праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» наведалі гісторыка-краязнаўчы музей «Бацькаўшчына», прымеркаваўшы гэту паездку да блізкага дня нараджэння пісьменніка і 30-годдзя з дня яго смерці. Вучаніца школы экскурсавод Даша распавяла пра Яна Скрыгана і экспанаты, прадстаўленыя ў памяшканні музея. Арганізатары музея падзяліліся ўспамінамі пра яго стварэнне, пра рэдкія краязнаўчыя экспанаты, якімі вельмі актыўна з дапамогай жыхароў Каменя папаўняецца музей. Цікавасць наведвальнікаў выклікаў макет хаты, дзе нарадзіўся Ян Скрыган, створаны супрацоўнікамі і вучнямі школы.

Цікавую гісторыю распавяла Галіна Іванаўна пра «камізэльку» (так называў пінжак пісьменнік), якую ён прасіў яе пашыць і хацеў, каб там было шмат кішэняў. У выніку яна сшыла пінжак, які меў вялікую колькасць самых разнастайных кішэняў і кішэнькаў, яго вельмі любіў насіць Янка Скрыган. Цяпер гэтая «камізэлька»-пінжак з'яўляецца экспанатам музея. У 2020 годзе, пад час юбілею пісьменніка, музей атрымаў новыя экспанаты – самаробныя кнігі, якія ствараў пісьменнік: на старонкі белай паперы наклейваў надрукаваныя тэксты, потым аздабляючы стос папер пераплётам.

Напярэдадні паездкі ў Камень я наведвала Галіну Скрыган. Цікава было пагутарыць, абмеркаваць планы па падрыхтоўцы да 120-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Яна зноў рыхтуе новае выданне і шукае шляхі выдаць кнігу да чарговага юбілею, які будзе адзначацца ў 2025 годзе.

Я гляджу на старое фота пісьменніка, што стаіць дома ў Галіны Іванаўны, і ўзгадваю словы з яе ўспамінаў, што выйшлі ў кнізе «Слова пра Яна Скрыгана» (2005): *«У нас дома вісіць яго надзвычайны партрэт, дзе ён глядзіць на наш свет з добрай усмешкай, падпіраючы далонёю падбароддзе. Калі я сустракаюся з яго праніклівым, добрым і мудрым позіркам, на душы становіцца спакайней. І такой дробнай здаецца ўся нашая людская марнасць»*.

***Таццяна ЛАЎРЫК***



*У музеі «Бацькаўшчына». 16 кастрычніка 2022 г. Фота І. Тагіль*



*Фотаздымак Яна Скрыгана на кватэры ў Г. Скрыган. 2020 г. Фота Т. Лаўрык*